# ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ

## 2 клас

## ХРЭСТАМАТИЯ

Для ўстаноў агульнаі сярядняі адукацыі з беларускай мовай навучання



# Змест

**Беларускія народныя казкі....................3**

Дзедава рукавічка....................3

Каза-манюка....................6

Казка пра быка і яго сяброў....................9

Камары і мядзведзь....................13

Лісіца і гусак....................14

Не сілай, а розумам....................15

Хітры вол....................16

**Міхась Чарот....................18**

Вясенняя раніца....................18

# Беларускія народныя казкі

## Дзедава рукавічка

Ішоў дзед лесам, а за ім бег сабачка. Ішоў дзед, ішоў дый згубіў рукавічку. Вось бяжыць мышка, залезла ў тую рукавічку ды кажа:

– Тут я буду жыць.

А тым часам жаба – скок-скок! – пытаецца:

– Хто, хто ў рукавічцы жыве?

– Мышка-скрабушка. А ты хто?

– А я жабка-скакуха. Пусці і мяне!

– Хадзі.

І Вось іх ужо двое. Бяжыць зайчык. Падбег да рукавічкі, пытаецца:

– Хто, хто ў рукавічцы жыве?

– Мышка-скрабушка, жабка-скакуха. А ты хто?

– А я зайчык-уцякайчык. Пусціце мяне!

– Хадзі.

Вось іх ужо трое. Бяжыць лісічка:

– Хто, хто ў рукавічцы жыве?

– Мышка-скрабушка, жабка-скакуха ды зайчык-уцякайчык. А ты хто?

– А я лісічка-сястрычка. Пусціце і мяне!

Вось іх ужо чацвёра сядзіць. Аж бяжыць воўк і таксама да рукавічкі, дый пытае:

– Хто, хто ў рукавічцы жыве?

– Мышка-скрабушка, жабка-скакуха, зайчык-уцякайчык ды лісічка-сястрычка. А ты хто?

– А я ваўчок – шэры бачок. Пусціце і мяне.

– Ну хадзі ўжо!

Залез і гэты – стала іх ужо пяцёра. Раптам брыдзе[1] дзік:

– Рох-рох-рох, хто ў рукавічцы жыве?

– Мышка-скрабушка, жабка-скакуха, зайчык-уцякайчык ды лісічка-сястрычка, ваўчок – шэры бачок. А ты хто?

– А я дзік ікласты. Пусціце і мяне!

Вось нявыкрутка, усім у рукавічку ахвота.

– Табе і не ўлезці!

– Неяк залезу, пусціце!

– Ну што ж з табой паробіш, лезь!

Залез і гэты. Ужо іх шасцёра. Так ім цесна, што яны павярнуцца нават не могуць. А тут затрашчала сучча – вылазіць мядзведзь і таксама да рукавічкі ідзе, раве:

– Хто, хто ў рукавічцы жыве?

[1] **Брысці –** ісці павольна, з цяжкасцю перастаўляючы ногі; цягнуцца.

– Мышка-скрабушка, жабка-скакуха, зайчык-уцякайчык ды лісічка-сястрычка, ваўчок – шэры бачок ды дзік ікласты. А ты хто?

– Гу-гу-гу, шмат вас тут! А я мядзведзюхна-бацюхна. Пусціце і мяне!

– Як жа мы цябе пусцім? І так цесна.

– Ды як-небудзь!

– Ды хадзі ўжо, толькі з краёчку!

Залез і гэты – сямёра стала, ды так цесна, што рукавічка як бач разарвецца.

А тым часам дзед спахапіўся – няма рукавічкі. Ён тады вярнуўся шукаць яе. А сабачка наперадзе пабег. Бяжыць, бяжыць, аж бачыць – ляжыць рукавічка і варушыцца. Сабачка тады: «Гаў-гаў-гаў!»

Звяры спужаліся, з рукавічкі вырваліся ды ўроссып[1] па лесе. Ну а дзед прыйшоў ды забраў рукавічку.



[1] **Уроссып** – у розныя бакі.

## *Каза-манюка*

Жылі дзед ды баба з дачкою. І была ў іх каза. Пагнала дачка пасвіць казу. Цэлы дзень пасвіла па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы. Увечары прыганяе дахаты. Дзед пытаецца ў казы:

– Каза мая, козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Кажа каза:

– Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

Насварыўся дзед на дачку, што дрэнна казу пасвіла, і назаўтра выправіў бабу.

Цэлы дзень пасвіла баба казу па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы. Увечары прыганяе дахаты.

Дзед зноў пытаецца ў казы:

– Каза мая, козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

–Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

Дзед і на бабу насварыўся, што дрэнна казу пасвіла. Надзеў тады дзед бабін каптан і хустку ды пайшоў сам пасвіць казу. Цэлы дзень пасвіў па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы. Увечары вярнуўся дахаты, пераапрануўся, сеў на прызбе і чакае казу з пашы.

Прыйшла каза на двор. Дзед пытаецца:

– Каза мая, козачка, дзе была? Што ты ела, што піла?

Каза кажа:

– Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

Узлаваўся дзед на казу-манюку, прывязаў яе за плот, а сам пайшоў касу вастрыць, казу-манюку рэзаць.

Дазналася аб гэтым каза, сарвалася з прывязі і пабегла ў лес. Знайшла ў лесе зайчыкаву хатку, залезла ў яе і жыве там, а зайчыка і на парог не пускае.

Сеў зайчык пад елачкай і плача. Ідзе воўк:

– Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

– Як жа мне не плакаць, як не журыцца? Была ў мяне хатка – новая, яловая. Прыйшоў нейкі звер рагаты ды барадаты, выгнаў мяне з хаты і сам у ёй жыве, а мяне і на парог не пускае.

– Ну добра, не плач, я таго звера выганю.

Падышоў воўк да зайчыкавай хаткі, пастукаў хвастом у дзверы і кажа:

– Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

А каза як затупае за дзвярыма, як замэкае:

– Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Спужаўся воўк ды ад бяды ўцёк. А зайчык зноў сеў і плача. Ідзе мядзведзь:

– Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

– Як жа не плакаць, як не журыцца?

І расказаў мядзведзю пра сваю бяду.

– Ну добра, – кажа мядзведзь, – не плач, я таго звера адразу выганю.

Падышоў ён да зайчыкавай хаткі, патупаў каля дзвярэй ды кажа:

– Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

А каза як затупае, як замэкае:

– Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Спужаўся і мядзведзь ды ў гушчар – кульгецьˡ, кульгець... Ідзе певень. Убачыў заплаканага зайчыка і пытаецца:

– Чаго, зайчык, плачаш? Чаго, брат, зажурыўся?

– Як жа мне не плакаць, як не журыцца?

І расказаў зайчык пра сваю бяду.

– Э, – кажа певень, – такую бяду я адной лапай развяду. Я таго звера ведаю – гэта дзедава каза-манюка...

Падышоў певень да зайчыкавай хаты, залопаў крыламі, закукарэкаў:

– Кукарэку! Кукарэку!

Заб’ю казу-недарэку!

Пачула каза ды як затупае, як замэкае:

– Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

Тады певень яшчэ мацней залопаў крыламі і закрычаў:

– Гэй, каза, збірай манаткі,

Уцякай хутчэй ты з хаткі.

Бо вунь дзед ідзе,

Ён касу нясе...

Як пачула каза пра дзеда з касою, напужалася і кулём выскачыла з хаткі. А зайчык з пеўнікам зайшлі ў хатку і сталі там жыць-пажываць ды дабра нажываць.



[1] **Кульгець** - нясмела хадзіць, ісці

# *Казка пра быка і яго сяброў*

Пасвіўся на лузе бык. Убачыў ён каля рэчкі туман і напужаўся: падумаў, што зямля і вада гараць.

«Пабягу я лепш адгэтуль на край свету!» – парашыў бык.

Задраў хвост і пабег.

Сустрэўся яму па дарозе казёл:

– Бык, куды бяжыш?

– На край свету.

– Чаго?

– У нас зямля і вада гараць. Баюся, каб і мне не згарэць.

– Пабягу і я з табою.

– Бяжы.

Бягуць яны, а насустрач ім парсюк:

– Куды бежыце?

– На край свету: у нас зямля і вада гараць! Баімся, каб і нам не згарэць.

– І я з вамі пабягу.

– Бяжы.

Бягуць яны ўтрох. Сустракае іх гусак:

– Куды бежыце?

– На край свету: у нас зямля і вада гараць! Баімся, каб і нам не згарэць.

– І я з вамі пабягу.

– Бяжы.

Бягуць яны ўчатырох. Сустракае іх певень:

– Куды бежыце?

– На край свету: у нас зямля і вада гараць…

– І я з вамі пабягу.

– Бяжы.

Беглі, беглі, прыбеглі ў лес. А тут і зіма надыходзіць. Бык кажа:

– Ну, хопіць бегчы: зімою зямля не загарыцца. Давайце будзем хату рабіць ды запасы на зіму рыхтаваць.

Парсюк кажа:

– Мне хаты не трэба: я выкапаю сабе яму, нанашу туды моху на падсцілку, жалудоў на харч ды буду зімаваць. Мне і так цёпла будзе!

Казёл кажа:

– А я карою пракармлюся, у дупле пагрэюся.

– А ты, гусак? – пытаецца бык.

– У мяне пер’е цёплае, я дзюбу ў яго схаваю ды так перазімую.

– А ты, певень?

– А мне што, я і пад ялінкаю перазімую.

Што рабіць? Узяўся бык адзін хату будаваць. Нанасіў бярвення, моху, збудаваў цёплую хату і жыве сабе ў ёй без бяды.

Насталі маразы. Парсюк круціўся, круціўся ў яме, не вытрымаў ды пайшоў да быка:

– Пусці, бык, у хату: сцюдзёна вельмі…

– Не, – кажа бык, – не пушчу: ты ў мох закапаешся, табе і так цёпла будзе!

– Калі не пусціш, – кажа парсюк, – дык я падкапаю лычам падрубу[1] – твая хата абернецца, ды яшчэ і цябе самога задушыць.

Напужаўся бык: хочаш не хочаш, трэба пускаць парсюка ў хату.

– Ну, добра, – кажа, – ідзі: удвух весялей будзе.

На другі дзень прыходзіць казёл:

– Пусці, бык, у хату.

[1] **Падруба -** ніжняе бервяно ў зрубе.

– Навошта табе хата: ты ў дупле перазімуеш!

– Ну, калі не пусціш, дык я разганюся, стукну рагамі ў сцяну і праб’ю дзірку: мароз залезе ў хату, табе холадна будзе.

Што рабіць быку – пусціў казла.

– Добра, – кажа, – хата ў мяне не малая: хопіць і траім месца.

На трэці дзень прыходзіць гусак:

– Бык, бык, пусці ў хату пагрэцца!

– Не пушчу!

– Чаму?

– У цябе пер’е цёплае, ты ў яго дзюбу схаваеш ды і так перазімуеш.

– Ну, калі не пусціш, дык я дзюбаю ўсю страху расцягаю, табе холадна будзе.

Спужаўся бык – пусціў і гусака.

На чацвёрты дзень прыходзіць певень:

– Пусці, бык, у хату!

– А хіба табе пад ялінкаю не цёпла? – засмяяўся бык. – Не пушчу! У мяне цесна.

– А калі не пусціш, дык я ўзлячу на гару і ўвесь пясок са столі[1] зграбу: дух з хаты праз столь выйдзе, і ты замерзнеш.

Спужаўся бык – пусціў і пеўня. Жывуць яны ў хаце ўпяцёх. Ідзе мядзведзь. Убачыў хату.

– Хто тут жыве? – пытаецца.

– Бык, казёл, парсюк, гусак і певень, – адказваюць з хаты.

– Пусціце і мяне пагрэцца.

– Не, не пусцім! Ты нам не кампанія. Мядзведзь стукнуў лапаю ў дзверы, праламаў іх і ўвайшоў у хату.

---

[1] **Столь –** верхняе ўнутранае пакрыццё памяшкання, процілеглае падлозе.

Тут бык выставіў рогі ды прыпёр мядзведзя да сцяны. А казёл давай яму рагамі ў бок лупіць, а парсюк зубамі за жывот ірваць, а гусак у нос дзяўбці… А певень узляцеў на лаву ды давай крычаць: «Кудах-кудах! Куды-куды!» Ледзьве жывы выскачыў з хаты няпрошаны госць – мядзведзь.

Ідзе ён па лесе, сустракае ваўка.

– Дзе быў, сусед? – пытаецца ў яго воўк. – Чаму ты такі хмуры?

– Ой, – кажа мядзведзь не сваім голасам, – трапіў я да страшэнных разбойнікаў. Адзін мяне віламі да сцяны прыціснуў – не павярнуцца. Другі ражнамі ў бок таўчэ. Трэці абцугамі[1] кішкі выцягвае. Чацвёрты спіцаю ў нос коле. А пяты, у чырвонай шапачцы, ззаду шабля крывая, на нагах шпоры, бегае па лаве ды ўсё крычыць: «Падай, падай яго сюды!» Добра, што я ўцёк, бо не ведаю, што б гэты пяты зрабіў са мною…

З таго часу больш ні мядзведзь, ні воўк у тую хату не заглядвал.



[1] **Абцугі –** металічны інструмент, які выкарыстоўваецца ў кавальскай справе для захоплівання і заціскання жалеза.

# Камары і мядзведзь

Аднойчы забраўся мядзведзь у балота і лёг на купіну[1] адпачыць. Як лёг, дык шмат камароў падавіў, якія сядзелі на той купіне.

Усхапіліся суседнія камары з іншых купін, загудзелі, запішчалі, закружылі вакол яго. А самы галоўны з іх дык гучней за астатніх пішчыць. Пішчыць, не супакойваецца:

– Чаго ты, касалапы, сюды прыйшоў? Навошта пагубіў нас столькі? Уцякай адсюль, пакуль жывы!

Пішчыць ваяўніча. А мядзведзь глядзіць навокал, голас піскрывы чуе, але нікога не бачыць. Потым угледзеў камароў, вырваў бярэзіну і давай махаць. Пакуль махае, дык не чуваць нікога, а як перастане, то камары зноў пагражаюць:

– Уцякай адсюль, касалапы, не то жывым не застанешся.

Кінуўся мядзведзь на іх, ды толькі што ён зробіць? Наскакаўся, намахаўся, знясілеў, а камары яшчэ больш настойліва атакуюць ды балюча кусаюць. І вымушаны быў ён уцякаць з балота. А камар той, самы галоўны, крычыць на самае вуха:

– Будзеш цяпер ведаць, касалапы, як нас крыўдзіць.



[1] **Купіна** – кучка зацвярдзелай зямлі на нізкім або балоцістым месцы, аброслая травой, мохам.

# *Лісіца і гусак*

Неяк Лісіца злавіла Гусака і кажа: «Гусак, Гусак, я цябе з’ем!»

Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, Лісачка. Толькі дазволь мне перад смерцю патанцаваць».

Ліса адказвае: «Танцуй сабе, а з’есці я цябе яшчэ паспею». Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пераступаць.

Глядзіць Ліса на Гусака і смяецца: «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»

А Гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу пераступаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася Лісіца з разяўленым ротам.



# *Не сілай, а розумам*

Адзін чалавек пайшоў у лес дровы секчы. Насек дроў, сеў на пень адпачыць. Прыходзіць мядзведзь.

– Гэй, чалавеча, давай будзем бару́кацца[1]!

Паглядзеў чалавек на мядзведзя: дужы калмач – дзе з ім барукацца! Сцісне лапамі – і дух вон!

– Э, – кажа чалавек, – што мне з табою барукацца! Давай спярша паглядзім, ці маеш ты сілу.

– А як глядзець будзем? – пытаецца мядзведзь.



Узяў чалавек сякеру, расшчапіў пень зверху, убіў у расколіну клін і кажа:

– Калі раздзярэш гэты пень лапаю, – значыць, маеш сілу. Тады я з табою буду барукацца.

Ну, мядзведзь, не падумаўшы, тыц лапу ў расколіну. А чалавек тым часам трах абухом па кліне – той і выскачыў.

Тут пень і сціснуў мядзведзеву лапу, як абцугамі[2].

Раве мядзведзь, танцуе на трох лапах, але ні расшчапіць пень, ні вырвацца з яго не можа.

– Ну, што, – кажа чалавек, – будзеш барукацца са мною?

– Не, – енчыць мядзведзь. – Не буду.

– Вось бачыш, – сказаў чалавек. – Не толькі сілаю барукацца можна, а і розумам.

Убіў ён клін назад у пень, мядзведзь вырваў лапу ды ходу ў гушчар без агля́дкі.

З таго часу ён і баіцца сустракацца з чалавекам.

---

[1] **Барукацца** – дужацца

[2] **Абцугі –** металічны інструмент, які выкарыстоўваецца ў кавальскай справе для захоплівання і заціскання жалеза.

## *Хітры вол*

Пайшоў вол сена касіць. Косіць, пракосы разбівае, сушыць, ды на неба пазірае: каб хоць вецер хмары не прыгнаў. «Пакуль добрае надвор’е, – думае, – сена насушу, у стог складу, тады і зімы няма чаго баяцца».

Тут воўк ідзе. Убачыў ён вала.

– Ты бык? – пытае.

– Не, я вол.

– Сена косіш?

– Кашу.

– Рагамі грабеш?

– Грабу.

– Хвастом падграбаеш?

– Падграбаю.

– А мяне ты не баішся? Зірнуў на яго вол і кажа:

– Ды не толькі цябе, але і двух такіх не баюся!

Паверыў воўк і пайшоў шукаць сабе памочнікаў. Назаўтра прыходзіць ужо з двума братамі.

– Ты бык? – зноў пытае.

– Не, я вол.

– Сена косіш?

– Кашу.

– Рагамі грабеш?

– Грабу.

– Хвастом падграбаеш?

– Падграбаю.

– А трох нас ты таксама не баішся?

Што валу рабіць? Давай ён далей хітрыць.

– Не толькі трох, – кажа, – а і чатырох не баюся.

Паверылі ваўкі і падаліся шукаць новых сяброў.

Доўга шукалі. Нарэшце прыходзяць на балота цэлаю воўчай зграяй. Глядзяць, а там ужо стог сена стаіць і вала не відаць.

Кінуліся злосныя ваўкі па следзе і прыбеглі да двара, дзе вол жыў. А ягоны двор высокім частаколам абгароджаны. Круціліся, круціліся ваўкі, скакалі, скакалі, але да вала так і не дабраліся.

– Ага, – закрычалі яны са злосці. – Ты, баязлівец, схітрыў!

– Хай сабе і схітрыў, – кажа вол, – толькі ж стог сена ў пагодлівыя дні накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася.

І пацягнуліся ваўкі прэч, хвасты падцяўшы[1].



[1] **Падцяўшы** хвасты – падкруціўшы хвасты.

# Міхась Чарот

## Вясенняя раніца

Гляньце, дзеткі, у аконца,
Ды пара ужо ўставаць...
Як прыгожа там бясконца!
Сорам, дзеткі, позна спаць.

Заглянула сонца ў вочкі,
Дзень прыйшоў – даволі сну!
На свет гляньце, галубочкі,
Ўсе вітаюць там вясну.



Пчолкі выпаўзлі з калоды,
Пачалі збіраць мядок,
Шпак вартуе агароды
І вішнёвы наш садок.

Зелянее траўка ў полі,
Ў небе птушачкі пяюць…
Эх, зімы не будзе болей!
Хутка кветкі зацвітуць.

Вы зірніце у аконца,
Палюбуйцеся хаця:
Колькі волі, колькі сонца,
Колькі новага жыцця!

Ўстаньце, дзеткі, пойдзем ў поле
Спевы слухаць, кветкі рваць.
Ў хаце сумна, бы ў няволі…
Ўстаньце дзеткі, годзе спаць!

